# Спецыфіка карэкцыйна-аднаўленчай працы пры семантычнай афазіі

Склала:
выкладчык
кафедры лагапедыі БДПУ
Лагун Т.Т.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры семантычнай афазіі

**Асноўнай задачай аднаўленчага навучання** пры семантычнай афазіі з'яўляецца пераадоленне парушэнняў прасторавага гнозісу з мэтай пераадолення імпрессіўнага аграмматызму.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры семантычнай афазіі

**Л.С. Цвяткова** вылучыла 2 **стадыі** аднаўленчага навучання пры семантычнай форме афазіі.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры семантычнай афазіі

Задачай **<u>першай стадыі</u>** навучання з'яўляецца:

аднаўленне працэсаў успрымання і разумення адносін прадметаў у прасторы.

.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры семантычнай афазіі

* Аднаўленчае навучанне на **першай стадыі** пачынаецца з пазнавання намаляваных геаметрычных фігур шляхам параўнання двух зададзеных узораў.
* Затым пераходзяць да перадачы зададзеных фігур па ўзору, спачатку з дапамогай метаду малявання, затым – метаду актыўнага канструявання зададзеных фігур з дадзеных элементаў (з палачак, кубікаў).
* Далей да ўзору далучаецца моўная інструкцыя, з дапамогай якой замацоўваюцца маўленчыя абазначэнні месца прасторы: «верх-ніз», «справа-злева» і інш. Паралельна ідзе работа над параўнальнымі паняццямі «менш-больш», «цямней-святлей» і інш.
* Потым пераходзяць да аднаўлення ўсведамлення схемы свайго цела, яго становішча ў прасторы.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры семантычнай афазіі

Асноўнай задачай аднаўленчага навучання на **другой стадыі** з'яўляецца аднаўленне працэсу разумення маўлення, яе логіка-граматычных структур.

Асноўную ўвагу надаюць аднаўленню разумення флектіўных канструкцый, канструкцый з прыназоўнікам.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры семантычнай афазіі

**Аднаўленне разумення прыназоўнікаў пачынаецца:**

* з аднаўлення аналізу прасторавых адносін прадметаў з паступовым абстрагаваннем ад канкрэтных прадметаў з наступным абагульненнем і схематызаваннем гэтых адносін і перакладам іх на маўленчы ўзровень.

З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца:

- метад прадмета і прасторы;
- метад малявання схемы размяшчэння прадметаў адносна адзін аднаго па канкрэтнаму ўзору;
- метад падбору прыназоўнікаў да дадзеных прасторавых схем і інш.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры семантычнай афазіі

**Аднаўленне разумення флектіўных канструкцый пачынаецца:**

* з аднаўлення ўсвядомленага аналізу адносін і сувязі паміж словамі ўнутры фразы. З гэтай мэтай выкарыстоўваецца ***метад пастаноўкі адпаведных пытанняў*** да кожнага слова ўнутры фразы.
* Хворага вучаць разбору сказа па яго частках, абапіраючыся на іх сэнсавую ролю ў ім. З гэтай мэтай выкарыстоўваецца ***метад дэфіцыту (або няскончанасці) інфармацыі***.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры семантычнай афазіі

**Вялікая ўвага пры дадзенай форме афазіі надаецца аднаўленню разумення сэнсу прыказак, прымавак, метафар.**

* З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца эмацыйна значныя, насычаныя вялікім гумарам малюнкі мастака Х.Бідструпа, малюнкі з гумарыстычных часопісаў, рэпрадукцыі гумарыстычных і драматычных карцін вядомых мастакоў. Хвораму даецца заданне напісаць па іх «сачыненне» з ужываннем вызначаных метафар, прыказак і прымавак.
* Акрамя таго, хвораму прапануюцца заданні на чытанне і пераказ сваімі словамі некаторых сэнсавых абаротаў з баек І.А.Крылова, рускіх народных казак, гумарыстычных тэкстаў.

# Літаратура:

1. Цвяткова, Л.С. Афазія і аднаўленчае навучанне / Л.С.Цвяткова. - М., 1988.
2. Шохар-Троцкая, М.К. Карэкцыйна-педагагічная работа пры афазіі / М.К. Шохар-Троцкая. - М. 2002.